# З думкай пра Беларусь

## Якія перавагі дае выбаршчыкам адзіны дзень галасавання і чаму важна быць у тэме?

Спярша крыху з гісторыі пытання, як кажуць. 27 лютага 2022 года адбыўся рэспубліканскі рэферэндум. На ім абсалютная большасць грамадзян падтрымала змяненні і дапаўненні ў Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь. І ўжо 15 сакавіка, якраз у Дзень Канстытуцыі, Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка падпісаў рашэнне рэферэндума – абноўлены Асноўны Закон уступіў у сілу. «Падзея ўвойдзе ў падручнікі як чарговая вяха развіцця суверэннай краіны», – сказаў тады на ўрачыстай цырымоніі кіраўнік дзяржавы.

Уласна, вось так, па волі народа, у грамадска-палітычным жыцці нашай краіны з'явіўся ключавы элемент электаральнай кампаніі – адзіны дзень галасавання. Паводле дзейнай Канстытуцыі, ён праводзіцца ў апошнюю нядзелю лютага і ў будучым годзе прыпадае на 25-е чысло. Адразу звяртае на сябе ўвагу наступнае. Самы канец зімы, пагадзіцеся, – гэта найбольш аптымальны і зручны час: не турбуюць дачы, падрыхтоўка дзяцей да школы і іншыя жыццёвыя клопаты. Можна спакойна прыйсці на ўчастак і прагаласаваць, тым самым выканаўшы свой грамадзянскі абавязак.

Кожны выбаршчык на гэты раз атрымае не адзін бюлетэнь, як на папярэдніх выбарах, а два, тры, а то і чатыры – апошняе датычыць вяскоўцаў. Ім давядзецца, акрамя дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў, абласнога і раённага Саветаў, абраць яшчэ сваіх вылучэнцаў у сельскі ці пасялковы Савет.




Цэнтрвыбаркам зацвердзіў візуальную канцэпцыю выбарчай кампаніі 2024 года

Такім чынам, у адзін дзень у краіне мае быць створана дэпутацкая вертыкаль. У арганізацыйным плане гэта вельмі зручна для ўсіх удзельнікаў электаральнай кампаніі, выбаршчыкаў найперш. І не будзем забываць пра тое, што кожныя выбары каштуюць немалых грошай. Куды патрацiць сэканомленыя дзякуючы адзінаму дню галасавання сродкі, у дзяржаве знойдзецца. Гэта і будаўніцтва жылля, рамонт дарог, узвядзенне школ ці дзіцячых садоў – у любым выпадку ўсё робіцца для людзей.

Усяго 12,6 тысячы чалавек – вось такі магутны дэпутацкі корпус краіны, ад ніжняй палаты парламента да сельскіх Саветаў, належыць сфарміраваць нам літаральна праз тры месяцы. Лічба не тое што ўражвае, не. Хутчэй, прымушае задумацца пра вялікую адказнасць, якая кладзецца на людзей, што прыйдуць 25 лютага на выбарчыя ўчасткі. І калі я цяпер чую меркаванні, што адзіны дзень галасавання – гэта экзамен для беларусаў на грамадзянскую сталасць, цалкам з гэтым пагаджаюся. Па адной простай прычыне:

на гэты раз ніякім чынам нельга памыліцца ў сваім выбары. Па сутнасці, упершыню ў найноўшай гісторыі будзем галасаваць у такіх умовах, калі шматкроць вырастае асабістая адказнасць за лёс краіны. Архіскладаны час, у якім цяпер жывём, вымагае ад кожнага нашага кроку і ўчынку як мінімум разважнасці і разумення, усведамлення моманту.

Па вялікім рахунку ў прадстаўнічыя і заканадаўчы органы ўлады павінны трапіць патрыёты. Але не тыя псеўдасыны Радзімы, што крычаць пра сябе на кожным скрыжаванні і клянуцца ў любові і вернасці Беларусі, не. Надзейныя і беспамылковыя маркеры патрыятызму – справы і ўчынкі. Як гаворыцца, глядзі і рабі высновы. Вядома, нашымі выбраннікамі будуць людзі з разнастайнымі, часам супрацьлеглымі пунктамі гледжання. І гэта цалкам нармальна. Абсалютна зразумела і бясспрэчна толькі адно: сярод іх не можа быць ворагаў. Яно не патрэбна нікому – ні ўладзе, ні грамадству.

На маю думку, гэтым разам нават да вылучэння ў сельскія ці пасялковыя Саветы не варта ставіцца паблажліва, альбо, як часам кажуць у вёсках – па-свойску, абы нехта там быў. Навошта выбіраць людзей, якім да лямпачкі тутэйшае жыццё і людзі са сваімі «нікчэмнымі» клопатамі? Урэшце, якасны склад дэпутацкага корпусу на мясцовым узроўні – гэта своеасаблівы паказчык, такая адмыслова хітрая лакмусавая паперка, якая шмат чаго можа сказаць пра насельнікаў той ці іншай сельскай тэрыторыі.

Адзіны дзень галасавання, зразумела, кульмінацыя электаральнай кампаніі. І калі мы разважаем менавіта пра адказны і ўзважаны выбар, то відавочна, што проста прыйсці і кінуць бюлетэні ў скрыню, не атрымаецца. Ідэальны варыянт – наведаць выбарчы ўчастак з гатовым рашэннем. А гэта значыць, давядзецца быць так ці інакш уцягнутым у працэс: цікавіцца сваімі кандыдатамі, не ігнараваць запрашэнні на сустрэчы з імі і г. д. І тут ніякіх праблем – выбарчы працэс у нашай краіне ідзе адкрыта, было б жаданне. А яно, на маю думку, нават калі пакуль няма, павінна з'явіцца. Не той час і не тыя абставіны, каб адседжвацца ў кустах. І вельмі важна быць сёння адзінымі, каб надзейна і годна разам з Прэзідэнтам, усёй краінай трымаць удар сучасных выклікаў і пагроз.

Несумненна, што і роля дэпутатаў усіх узроўняў набывае новае асэнсаванне, асабліва тых, хто прэтэндуе на крэсла ў Авальнай зале. І новы парламент з вялікай доляй верагоднасці будзе адрозніваца ад цяперашняга. Пра галоўную задачу будучых дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў выразна і вельмі дакладна на нядаўняй сустрэчы з кіраўнікамі палітычных партый сказаў Аляксандр Лукашэнка: «Давядзецца ўзяць на сябе вялікую нагрузку і адыграць сур'ёзную ролю ў будучым развіцці краіны». Паводле абноўленай Канстытуцыі, партыям нададзены шырокія магчымасці ўдзелу ў выбарчым працэсе, што з'яўляецца важным акцэнтам цяперашняй электаральнай кампаніі. «Гэта людзі павінны быць выключна дзяржаўныя. Такія, як кіраўнікі партый, якія сядзяць перада мной. І абавязкова прафесіяналы», – падкрэсліў Прэзідэнт, кажучы пра партыйных вылучэнцаў у заканадаўчы орган краіны. Відавочна, будзе мяняцца фармат парламенцкай работы, і палітычным сілам яшчэ належыць прайсці этап партыйнага будаўніцтва і, заваяваўшы давер народа, набыць рэальную моц, што аб'ядноўвае грамадства. Гэтыя выбары для іх, бадай, першы сур'ёзны экзамен.

Неўзабаве стануць вядомыя імёны кандыдатаў у дэпутаты, і выбарчая кампанія набярэ тэмп, імкнучыся да свайго лагічнага завяршэння. Надышоў вельмі важны і адказны час для ўсёй краіны, для кожнага з нас. Будзем памятаць пра гэта, асабліва ў вырашальны дзень 25-га лютага, і часцей у сваіх думках звяртацца да роднай Беларусі і яе будучыні.

*Ігар ГАНЧАРУК*